**Завядзееў, П.** «Дзякуй, брат!» / П. Завядзееў // Полацкі веснік. — 1996. — 1 кастр. — С. 3.

# «ДЗЯКУЙ, БРАТ!»



У нашай авіяцыйнай часці працяглы час служыць падпалкоўнік Гарбенка Аляксандр Валянцінавіч. Камандзір верталётнай эскадрыллі, ён больш 3-х тысяч гадзін правёў у паветры. У 1987 годзе ён выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан. Гэтая вайна несла незаменныя людскія страты, але быў і іншы бок медаля: менавіта там мужнеў воін-інтэрнацыяналіст, не шкадаваў сваіх сіл і выйшаў з гэтага пекла героем. Так, за пасяпяховае выкананне заданняў па аказанні інтэрнацыянальнай дапамогі ў Рэспубліцы Афганістан на грудзях у той час капітана Гарбенкі заззялі ордэны Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, а таксама ўзнагароды Рэспублікі Афганістан.

Асабліва запомнілася Аляксандру, як пасля вячэры выклікалі яго на камандны пункт батальёна: “Вось тут ідзе бой, камбат адзначыў алоўкам на карце, – ёсць два цяжка параненых – у жывот і галаву, да раніцы не дацягнуць. Зможаш выцягнуць?” Месца Аляксандру было вельмі добра знаёма: пясок і пыл. Пасадка ўдзень лічылася цыркавым трукам, слуп пылу ад вінта дасягаў да 300 метраў і што такое садзіцца на малую пляцоўку ведаў ён і камбат таксама. Яны глядзелі адзін аднаму ў вочы , усе афіцэры змоўклі – паўза зацягнулася. “Гэта немагчыма, сказаў Аляксандр, – ноччу выканаць пасадку ніякіх шанцаў”.

Камбат назваў прозвішчы параненых, у яго вачах бліснулі слёзы.

– Паспрабую, – вырвалася ў Аляксандра, і ў той жа момант ён пашкадаваў аб сказаным.

– Так, ты хоць паспрабуй, – шаптаў радасна камбат.

Экіпаж чакаў яго вяртання. Расказаў аб пастаўленай задачы і атрымаў “дабро” з Кандагару на вылет. Усе моўчкі сталі збірацца. Узляцелі, сталі выходзіць у раён, а вось і бой, які бачны па трасах і ўспышках разрываў. Гарэў БТР блакітна-зялёным полымем. Корпус раскаліўся да чырвані. Камандзір выйшаў на сувязь і ўбачыў ахоплены полымем БТР, пляцоўку ў баку ад бою. Выканалі заход на пасадку, зямля стала набліжацца, узняўся пылавы віхар. Правы лётчык абавязаны сачыць за яго набліжэннем і папярэдзіць камандзіра, які дакладна ведае, калі накрые вінтакрылую машыну. Усё гэтае можна прадбачыць днём, а ноччу… пылавы віхар накрыў верталёт, тут жа зніклі фары БТРа. Камандзір прыняў рашэнне на паўторны заход.

Другі заход таксама аказаўся няўдалым.

«Дарога!» Аляксандр адразу не змог зразумець, што хоча ад яго правы лётчык. Пасадку вырашылі зрабіць па-самалётнаму. Запытаўшы «зямлю», БТР стаў на прамы участак дарогі і фарамі абазначыў канец «паласы». Мі-8 заходзіць на пасадку, усё бліжэй і бліжэй зямля, уключылі фары і вось яна, дарога. Хуткасць не меней 50 км, на меншай накрывае пыл, а вось яно, доўгачаканае крананне, наблізіўшыся да БТРа затармазілі і выключылі фары.

Тут жа з цемры ўзніклі насілкі з параненымі. У галаве камандзіра адна думка – хутчэй, хутчэй, хутчэй. У гэты час яны – мішэнь. Нехта стукае ў блістэр. З цемры бачыцца запылены твар у чырвоным падсвеце. Чалавек сціснуў руку Аляксандра і нешта пракрычаў, схіліўшыся да яго. Але з-за шуму рухавікоў нічога не было чуваць і толькі па вуснах угадвалася: «Дзякуй, брат!»

**П. Завядзееў**,
**маёр**, **афіцэр па інфармацыі в/ч 13996**